www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

20 снежня 2005 года, № 22 (1930)

## З НОВЫМ ГОДАМ!

*Дарагія студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта!*

**Сардэчна віншую вас з надыходзячым 2006 годам!**

**Спадзяюся, новы год — год 85-годдзя БДУ — стане для нас усіх значным і плённым у творчай працы на карысць роднага універсітэта і ў ажыццяўленні асабістых спадзяванняў!**

**З задавальненнем можна адзначыць, што мінулы год быў паспяховым для нашых студэнтаў на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых конкурсах і алімпіядах, у спорце і культуры.**

**Важкі ўнёсак у скарбонку дасягненняў Беларускага дзяржаўнага універсітэта зрабілі нашыя навукоўцы, чые распрацоўкі былі адзначаны шматлікімі ўзнагародамі на прэстыжных рэспубліканскіх і міжнародных выставах.**

**У 2005 годзе, калі адзначалася 60-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, новымі формамі творчага супрацоўніцтва выкладчыкаў і студэнтаў узбагацілася патрыятычна-выхаваўчая работа ва універсітэце, больш змястоўнымі, разнастайнымі і цікавымі сталі культурныя мерапрыемствы. Шмат мы ўсе працавалі і над удасканаленнем якасці адукацыі, засваеннем сучасных тэхналогій.**

**Гэты працэс развіцця, паляпшэння і стварэння працягнецца, спадзяюся, і ў новым годзе!**

**Поспеху нам усім на гэтым шляху, шчыра жадаю здароўя і радасці!**

**Рэктар, прафесар В.І. СТРАЖАЎ**

БДУ-NEWS

### "ЗОРКА БДУ"

Ушанаванне жаночай футбольнай каманды "Зорка БДУ" адбылося ў ліцэі БДУ **16 снежня:** у чэмпіянаце Беларусі па футболе сярод маладзёжных камандаў яна заняла другое месца. Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел студэнты-першакурснікі ўсіх факультэтаў, студэнты-спартсмены, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта.

### САБРАЛІСЯ МОВАЗНАЎЦЫ

Рэспубліканскі навукова-практычны семінар "Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў школах Беларусі" адбыўся **15—16 снежня** на базе філалагічнага факультэта. Арганізатарамі яго, акрамя БДУ, выступілі Міністэрства адукацыі Беларусі і пасольства Расійскай Федэрацыі. Удзел у форуме прынялі навукоўцы і выкладчыкі з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Расіі.

### ДЫЯЛОГ СІНОЛАГАЎ

Першая міжнародная навуковая канферэнцыя "Кітайская цывілізацыя ў дыялогу культур" адбылася ў БДУ **15—17 снежня.** Арганізатарамі яе выступілі БДУ, рэспубліканскі цэнтр кітаязнаўства "Іерогліф" і пасольства КНР у Беларусі.

Канферэнцыя сабрала больш за 150 удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Кітая, Латвіі. Яны абмеркавалі шырокі спектр сіналагічных праблем у філалогіі, культуралогіі, паліталогіі, эканоміцы, гісторыі, філасофіі, геаграфіі, мастацтве, методыцы і дыдактыцы.

### ПСІХАЛОГІЯ І САЦЫЯЛОГІЯ Ў БІЗНЕСЕ

Першы міжнародны кангрэс "Псіхалогія і сацыялогія ў бізнесе: актуальныя праблемы сучаснасці" прайшоў **16—17 снежня.** Удзел у ім узялі дэлегацыі з Расіі, Украіны, Казахстана і краін Балтыі. Арганізатарамі кангрэсу выступілі БДУ, БДПУ, Цэнтр сістэмных бізнес-тэхналогій SATIO, БДЭУ, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Беларусі, Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы**

ПАДЗЕІ

## БДУ — ЛІДЭР ГОДА

БДУ стаў пераможцам конкурсу, які ладзіўся сярод арганізацыяў Маскоўскага раёна сталіцы па выніках работы 2005 г. Наш універсітэт заняў першае месца ў намінацыі "Патрыятычнае выхаванне моладзі". Узнагароду ўручыў кіраўнік адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы Я.М. Дукор. Ганаровай граматай за стварэнне аптымальных бяспечных умоў пражывання студэнтаў і высокі ўзровень арганізацыі выхаваўчай работы быў таксама ўзнагароджаны інтэрнат № 10 БДУ.

Конкурс праводзіцца ўжо 5 гадоў, яго мэта — раскрыць лідэрскія якасці моладзі. Сёлета было пададзена 63 заяўкі на ўдзел у 8 намінацыях.

**Святлана ДАЛГАНЮК**
**Фота Аляксандра СНАПКА**



*На фота: сакратар камітэта БРСМ БДУ А. Лянкевіч, загадчык сектара сацыяльнай работы ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю В. Казакова, начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю П. Скалабан.*

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## НАЙЛЕПШЫЯ АТРЫМАЛІ ПРЭМІІ

***Банк даных адоранай моладзі краіны папоўніўся 47 імёнамі студэнтаў БДУ.***



Ушанаванне студэнтаў БДУ, якія сталі лаўрэатамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, адбылося ў зале пасяджэнняў Вучонага савета. Пераможцы Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь атрымалі грашовыя прэміі, пасведчанні фонду і зборнікі навуковых работ "НДРС 2003—2004". Першую прэмію ў памеры 300 тыс. руб. заслужылі А.Б. Базылёва, С.У. Вайтовіч, К.А. Варанцова, А.А. Кажэмакс, В.А. Кудрашова, К.Г. Кузьмін, В.М. Навіцкая, А.А. Шчацько, С.М. Рабчынскі, другую прэмію ў памеры 200 тыс. руб. — М.В. Асташынская, Дз.С. Афанасенкаў, В.І. Захаранка, А.У. Клячкоўская, С.М. Лукашэвіч, Дз.Л. Мітрафанаў, А.М. Папляцееў, трэцюю ў памеры 150 тыс. руб. — А.А. Басько, А.Я. Верхатураў, В.С. Гарыцкая, М.В. Ярмоленка, В.В. Кірэеў, М.А. Мартысевіч, І.В. Пархоменка, А.В. Седзіна, М.С. Ціваноў, В.У. Фурс, А.А. Шасцітка, А.Н. Ярмола.

Грашовай прэміяй і пасведчаннем фонду былі ўзнагароджаны таксама пераможцы IV Рэспубліканскага конкурсу творчых работ навучэнцаў і студэнтаў "Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа (да 60-годдзя Перамогі над фашысцкай Германіяй)": М.К. Альховік, С.В. Кулінок, К.Н. Ходас, К.В. Цыганок (300 тыс. руб.), Дз.Л. Бакіноўскі, Я.А. Ганковіч, А.М. Дакунова, І.А. Дудко, Ю.В. Кірчук, Т.Г. Казлоўская, Т.І. Тамашава (200 тыс. руб.), С.А. Гур'еў, М.В. Карпёнак, С.У. Мазурына, А.Г. Петрачэнка, В.У. Пінчук, А.В. Солад, Ю.С. Шабрава, А.І. Эпштэйн (150 тыс. руб.).

Студэнтаў, аспірантаў, магістрантаў і выпускнікоў БДУ павіншавалі рэктар В.І. Стражаў і сакратар фонду Н.У. Пташнік.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## АД НАВУЧАННЯ — ДА СУМЕСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

***На пачатку снежня адбылася вельмі важная як для нашага універсітэта, так і для ўсёй краіны падзея: паміж рэктарам БДУ прафесарам В.І. Стражавым і рэктарам Харбінскага універсітэта навукі і тэхнікі прафесарам Жао Цы было падпісана пагадненне пра сумесную аспірантуру.***

Галоўнай мэтай гэтай новай формы міжнароднай дзейнасці ў галіне адукацыі з'яўляецца сумесная падрыхтоўка спецыялістаў высокага тэхнічнага ўзроўню: кандыдатаў навук, студэнтаў для атрымання ступені магістра і непасрэдна саміх магістраў. Кітайскі бок бярэ на сябе ўсе выдаткі за навучанне, пражыванне і выплату стыпендый. Штогод плануецца накіроўваць у БДУ па 20—30 аспірантаў з КНР, якія пад кіраўніцтвам беларускіх прафесараў будуць рыхтаваць і абараняць дысертацыі. Студэнты з Беларусі таксама атрымаюць магчымасць навучацца ў ВНУ Кітая: галоўным напрамкам будзе вывучэнне кітайскай мовы і культуры. Візіт кітайскай дэлегацыі паказаў надзвычайную зацікаўленасць кітайскіх партнёраў не толькі ў падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі, але і ў сумесных праектах у сферы адукацыі, навукі і тэхнікі. У Харбіне ўжо будуецца спецыяльны будынак для правядзення заняткаў і сумесных даследаванняў. Тут таксама размесціцца і унікальны беларуска-кітайскі навукова-тэхнічны цэнтр.



**Ірына ШЫК**

# НАША МОДА Ў ІТАЛІІ

Цэнтр сучаснага стылю і моды "Універсум модэлс" БДУ пад кіраўніцтвам А. Варламава пры дапамозе Пасольства Беларусі ў Італіі 1 снежня арганізаваў паказ калекцый беларускіх мадэльераў "Млын моды — 2005. Беларуская школа моды сустракае Італію". З італьянскага боку ў арганізацыі мерапрыемства дапамагла адміністрацыя правінцыі Рыма. Было паказана 33 калекцыі вопраткі, створаныя маладымі беларускімі мадэльерамі, студэнтамі і навучэнцамі ўстаноў адукацыі Беларусі, якія займаюцца падрыхтоўкай спецыялістаў у галіне моды. Аўтарамі калекцый выступілі пераможцы рэспубліканскага фестывалю-конкурсу моды і фота "Млын моды — 2005".

У падзячным лісце пасла Беларусі ў Італіі А. Скрыпко, што прыйшоў на імя рэктара БДУ В. Стражава, адзначаецца, што такі буйнамаштабны паказ сучаснай беларускай моды ў Італіі стаў першым у гісторыі беларуска-італьянскіх адносін. "Паказ беларускай моды ў італьянскай сталіцы стаў практычным працягам кантактаў, раней усталяваных Цэнтрам сучаснага стылю і моды "Універсум модэлс" пры спрыянні пасольства ў асноўных цэнтрах італьянскай моды — Мілане і Рыме", — адзначыў пасол.

**Падрыхтавала Алена КУРХІНЕН**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# СПЕЦЫЯЛІСТАЎ БДУ ЧАКАЮЦЬ У НАЦБАНКУ

*Цырымонія падпісання дагавора аб супрацоўніцтве паміж нашым універсітэтам і Нацыянальным банкам адбылася 1 снежня. У ёй прынялі ўдзел рэктар БДУ Васіль СТРАЖАЎ і старшыня Праўлення Нацбанка Пётр ПРАКАПОВІЧ.*



Дагавор прадугледжвае шырокі спектр напрамкаў супрацоўніцтва, у першую чаргу — стварэнне спрыяльных умоў для развіцця навучальнай інфраструктуры, падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у розных галінах банкаўскай дзейнасці і эканомікі.

Бакі дамовіліся арганізоўваць сумесныя семінары, канферэнцыі, сімпозіумы, круглыя сталы, стажыроўкі прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ і навучальных установ Нацыянальнага банка ў замежных навучальных установах і даследчых цэнтрах. Акрамя таго, запланавана спрыяць распрацоўцы і выданню падручнікаў, навучальных дапаможнікаў, манаграфій, публікацый артыкулаў выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ. Выкладчыкі і даследчыкі нашага універсітэта будуць выконваць навукова-даследчыцкія працы для Нацбанка, а банк — забяспечваць неабходнай інфармацыяй, даваць студэнтам магчымасць прайсці вучэбную і вытворчую практыкі, прымаць на стажыроўку выкладчыкаў і аспірантаў, накіроўваць найбольш перспектыўных спецыялістаў у магістратуру і аспірантуру БДУ, прызначаць стыпендыі найлепшым студэнтам універсітэта па шэрагу спецыяльнасцяў.

Неабходна адзначыць, што паміж БДУ і Нацбанкам ужо існуюць станоўчыя прыклады супрацоўніцтва. Так, ва універсітэце адбываецца падрыхтоўка спецыялістаў па некаторых спецыяльнасцях на факультэтах прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, эканамічным, міжнародных адносін, а таксама спецыялістаў найвышэйшай кваліфікацыі для Нацыянальнага банка праз магістратуру і аспірантуру. Нацыянальны банк забяспечвае практыку для студэнтаў універсітэта па профільных для банка спецыяльнасцях. Штогод ад універсітэта праходзяць практыку 5 студэнтаў-дыпломнікаў. Па выніках экзаменацыйных сесій тры студэнты універсітэта атрымліваюць стыпендыі Нацыянальнага банка ў памеры 4 базавых велічынь.

**Падрыхтавала Ірына ШЫК**

# КАБІНЕТ ІТАЛЬЯНСКАЙ ФІЛАЛОГІІ

***У апошнія гады філалагічны факультэт БДУ плённа супрацоўнічае з пасольствамі розных краін. Дзякуючы падтрымцы прадстаўніцтваў замежных краін у Беларусі былі адкрыты кабінеты кітайскай, польскай і ўкраінскай філалогіі. Сапраўдным навучальна-метадычным цэнтрам на факультэце стаў кабінет беларускай філалогіі. Вось і італьяністы адсвяткавалі наваселле.***

9 снежня адбылося ўрачыстае адкрыццё кабінета італьянскай філалогіі. У цырымоніі прымалі ўдзел рэктар БДУ прафесар В.І. Стражаў, прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар У.Л. Клюня, дэкан філалагічнага факультэта прафесар І.С. Роўда, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Італіі ў Беларусі Гульельма Ардзіццонэ, выкладчыкі і студэнты БДУ.

Для абсталявання кабінета метадычнымі і сучаснымі тэхнічнымі сродкамі навучання італьянскі бок прафінансаваў закупку неабходнай аргтэхнікі, аўдыё- і відэаматэрыялаў, перадаў кафедры раманскіх моў больш за тысячу экзэмпляраў навучальнай, навучальна-метадычнай, мастацкай і краязнаўчай літаратуры.

З 1997 г. на факультэце было падрыхтавана больш за 80 спецыялістаў у галіне італьянскай філалогіі. Цяпер рыхтуюцца вельмі распаўсюджаных і знакамітых сучасных пісьменнікаў. Сёння на кафедры раманскіх моў працуе 12 выкладчыкаў італьянскай мовы і літаратуры. У гэтым годзе да іх далучыўся пастаянны лектар, выкладчык і носьбіт італьянскай мовы, філолаг Андрэа Ло Мэо.

Дзякуючы гуманітарнаму супрацоўніцтву з Італіяй студэнты маюць магчымасць у якасці перакладчыкаў выязджаць у краіну вывучаемай мовы пры дапамозе разнастайных фондаў і асацыяцый. Такія паездкі дапамагаюць пазнаёміцца з нацыянальнымі традыцыямі і культурай народа, апынуцца ў гушчыні моўнага асяроддзя, убачыць найпрыгажэйшыя мясціны. Для тых, хто хоча звязаць свой лёс з навукай, існуе магістратура італьянскай мовы і літаратуры, аспірантура італьянскай літаратуры.



стаць выкладчыкамі італьянскай мовы і літаратуры яшчэ каля 150 студэнтаў. Італьянскае аддзяленне БДУ з'яўляецца адзіным у нашай краіне, дзе гэтая мова вывучаецца так шматбакова: лексікалогія, фанетыка і граматыка, гісторыя, культура і краіназнаўства, стылістыка і методыка выкладання. Вялікая ўвага надаецца літаратуры Італіі, якая вывучаецца не толькі ў межах курса сусветнай літаратуры, але вылучана ў самастойную дысцыпліну. На працягу сямі семестраў студэнты знаёмяцца з творамі італьянскіх аўтараў ад першых помнікаў літаратуры і вялікіх Дантэ, Петраркі, Бакачча да

Вынікам добрых узаемаадносін з Пасольствам Італіі сталі неаднаразовыя ўдзелы і перамогі студэнтаў і выкладчыкаў кафедры ў конкурсе на атрыманне вучэбнай стыпендыі ад Міністэрства замежных спраў. Вось ужо трэці год італьяністы выязджаюць на стажыроўкі ў розныя італьянскія універсітэты.

З нагоды правядзення ва ўсім свеце тыдня італьянскай мовы ў кінатэатры "Перамога" была наладжана дэманстрацыя італьянскіх фільмаў.

**Ірына ШЫК**
**Фотаздымак Аляксандра СНАПКА**

У ПРАФКАМЕ

# Злёт прафоргаў



***6 снежня адбыўся злёт прафсаюзнага актыву студэнтаў БДУ, у якім прымалі ўдзел прафоргі першых курсаў усіх факультэтаў, старшыні прафбюро студэнтаў і члены прафкама БДУ.***

На злёт былі таксама запрошаны прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Сувораў, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Р.В. Дапіра, галоўны тэхнічны інспектар працы ЦК прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі М.Л. Лясун і загадчык аддзялення прававой абароны, прававы інспектар працы Л.В. Манюк.

Галоўная мэта мерапрыемства — распавесці аб прафсаюзнай арганізацыі і асноўных кірунках яе дзейнасці, аб арганізацыі бяспечных умоў падчас правядзення навучальнага працэсу, ахове працы, здароўя і аб прававой дапамозе членам арганізацыі.

Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Н.М. Радзевіч выступіла з прамовай пра асноўныя кірункі дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі і яе функцыі. У прамове адзначалася, што пярвічная прафсаюзная арганізацыя сёння мае больш за 12.000 студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, 18 факультэцкіх арганізацый і 599 прафсаюзных груп: "Прафсаюз з'яўляецца прадстаўніком законных інтарэсаў сваіх членаў і вырашае шэраг канкрэтных пытанняў сацыяльнага, прававога і выхаваўчага характару: работа з найбольш праблемнымі сацыяльнымі катэгорыямі, арганізацыя адпачынку і санаторна-курортнага лячэння, кантроль за арганізацыяй харчавання, рашэнне жыллёва-бытавых пытанняў, аказанне матэрыяльнай падтрымкі членам прафсаюза і інш."

У. В. Сувораў у сваім выступе адзначыў важнасць адказнага стаўлення прафсаюзнага лідэра да сваёй дзейнасці. Ён прывёў прыклады фармальнага падыходу прафсаюзнага актыву да выканання сваіх абавязкаў, вынікам якога ў тым ліку сталі незапланаваныя фінансавыя выплаты БДУ і матэрыяльныя страты работнікаў. Як адзначыў прарэктар, пра такі падыход большасці актыўу гавораць і лічбы: па выніках даследавання, праведзенага Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ, толькі 17 % апытаных студэнтаў адзначылі, што з'яўляюцца членамі прафсаюза, хаця больш за 70 % студэнтаў БДУ плацяць прафсаюзныя ўзносы. Дзейнасць прафсаюзнай арганізацыі — адзін з элементаў адукацыйнага працэсу ў БДУ. І паводле словаў У.В. Суворава, такія злёты прафсаюзных лідэраў і патрэбны, каб разам аналізаваць, рабіць высновы — адным словам, вучыцца.

Звярнуліся да студэнцкага актыву і запрошаныя на мерапрыемства госці. З выступлення Л.В. Манюк удзельнікі злёту даведаліся пра бясплатную прававую дапамогу членам прафсаюзнай арганізацыі.

Р.В. Дапіра распавёў пра дзейнасць беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі па выкананні рашэнняў V з'езда ФПБ і IV з'езда галіновага прафсаюза. Улічваючы важнасць далучэння студэнцкай моладзі да актыўнай работы ў прафсаюзах, адзначыў ён, прафсаюзны камітэт павінен засяродзіць сваю дзейнасць на рашэнні такіх задач у маладзёжнай палітыцы, як выпрацоўка і ажыццяўленне сістэмы мераў па стварэнні нармальных умоў працы, побыту і адпачынку моладзі; павышэнне эфектыўнасці матывацыі прафсаюзнага членства сярод студэнтаў; спрыянне дзяржаўнай палітыцы ў галіне падрыхтоўкі маладых кадраў, удзел у правядзенні маніторынгу вынікаў размеркавання і працаўладкавання выпускнікоў і г.д.

М.Л. Лясун пазнаёміла прысутных з пагадненнем паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі па пытаннях, якія датычацца студэнцкай моладзі, і ахарактарызавала такія кірункі дзейнасці прафарганізацыі, як ахова працы, здароўя, арганізацыя бяспечных умоў навучальнага працэсу.

Напрыканцы мерапрыемства было праведзена анкетаванне. У выніку апрацоўкі анкет былі вылучаны найбольш цікавыя для прафсаюзнага студэнцкага актыву пытанні: працаўладкаванне, прававая абарона, арганізацыя адпачынку, аздараўленне, дзейнасць прафсаюзных арганізацый у іншых краінах.

За актыўную грамадскую работу 13 лепшых прафоргаў былі ўзнагароджаны падзякамі, фірмовымі майкамі і кнігамі "Беларускі дзяржаўны універсітэт. Праграмы перспектыўнага развіцця".

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**

